Нотная прадукцыя недзяржаўных выдавецтваў і выдавецкіх арганізацый у 1990—1994 гг. прадстаўлена 24 назвамі, што склала 15% ад агульнай колькасці нотных выданняў. Найбольш актыўна ў гэтым накірунку працавалі ТАА "ИТЛ БК", НВЦ "Аматар", ТАА "Нота". Акрамя камерцыйных выдавецтваў у выданні нотаў бралі ўдзел каталіцкія і пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі, якія выпусцілі зборнікі культавай музыкі і вакальных твораў духоўнага зместу.

За пяць гадоў недзяржаўныя выдавецтвы і выдавецкія арганізацыі выдалі 36 назваў кніг па мастацтве і рэжысёрскіх сцэнарыяў мастацкіх фільмаў, але іх дзейнасць у гэтым накірунку характарызавалася эпізадычнасцю, выпадковасцю выбару тэматыкі і мэтавага прызначэння выданняў.

Абагульненне вынікаў даследавання паказала, што выдавецкая дзейнасць творчых саюзаў і таварыстваў абумоўлівалася задачамі і зместам іх работы. Немастацкія грамадскія аб'яднанні выпускалі адзінкавыя выяўленчыя і нотныя выданні ў асноўным дзеля рэкламы або атрымання фінансавых сродкаў для сваёй дзейнасці. Па-іншаму будавалася дзейнасць камерцыйных арганізацый. Яе вызначаў рынкавы падыход да выбару напрамкаў укладання фінансавых сродкаў, відаў і тэматыкі выданняў.

Здаецца мэтазгодным прапанаваць некаторыя магчымыя накірункі далейшага развіцця дзейнасці недзяржаўных выдавецтваў і выдавецкіх арганізацый у галіне мастацтва. Пажаданым уяўляецца ўзбагачэнне тэматыкі такіх відаў выяўленчых выданняў, як паштоўкі і календары, за кошт шырэйшага выкарыстання сюжэтаў, звязаных з гісторыяй і культурай Беларусі. Не трэба скідваць з рахунку пазнавальныя магчымасці кніжак-цацак, коміксаў, ствараючы, напрыклад, выданні ў дапамогу тым, хто вывучае замежныя мовы.

Пажаданы больш шырокі ўдзел камерцыйных выдавецтваў у выпуску папулярнай, даведкавай і навучальнай літаратуры па мастацтве, якая карыстаецца попытам і недастаткова прадстаўлена на беларускім кніжным рынку.

## Беларускамоўная літаратура ў складзе недзяржаўных выдавецтваў

*Ала ФЯДОРЫНА, старшы выкладчык кафедры дакументазнаўства і бібліяграфіі Беларускага універсітэта культуры*

Родная мова з'яўляецца асновай светапогляду, падмуркам для вывучэння і успрымання нацыянальнай і далучэння да здабыткаў сусветнай культуры і літаратуры. Менавіта праз нацыянальную мову ў першую чаргу праяўляецца менталітэт народа, яго светаадчуванне, светаўспрыманне, светаразуменне.

Прынятце ў свой час у Беларусі шэрагу законаў, праграм, якія датычаць нацыянальнага адраджэння, спрыяла павелічэнню выпуску беларускамоўнай літаратуры. Аб гэтым сведчаць вынікі праведзеных у канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў XX ст. даследаванняў. Але сёння выдавецкая справа ў Беларусі, як і іншыя сферы жыцця, перажывае крызіс. Лідэрства на кніжным рынку цяжка стала ўтрымліваць нават буйным дзяржаўным выдавецтвам. Прыстасоўваючыся да складаных эканамічных умоў, ім даводзіцца арыентавацца на выпуск камерцыйна выгадных выданняў. Аднак апошнім часам у рэспубліцы значна змянілася структура выдавецкай сеткі. Акрамя дзяржаўных ствара-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юцца недзяржаўныя выдавецкія арганізацыі — сумесныя і малыя прадпрыемствы, акцыянерныя таварыствы, уласныя і кааператыўныя выдавецтвы, фірмы і г.д.

І калі ў 1992 г. установамі недзяржаўнага тыпу на беларускай мове было надрукавана толькі 8 назваў кніг тыражом 432,5 тыс. экз., то ў наступныя тры гады з пашырэннем сеткі недзяржаўных арганізацый гэта лічба ўзрасла. Таму мы лічым мэтазгодным зрабіць аналіз сучаснага стану кнігавыдання беларускамоўнай літаратуры недзяржаўнымі выдавецтвамі, яго колькаснае і якаснае размеркаванне па галінах ведаў і мэтавым прызначэнні.

Аналіз патоку твораў, выдадзеных недзяржаўнымі ўстановамі на роднай мове ў 1993—1995 гг., сведчыць пра тое, што яны склалі адпаведна 15; 14,4 і 11,8% . Сярод актыўных кнігавыдаўцоў можна адзначыць НВК "Тэхналогія", выдавецкую фірму "Асар", НКФ "Экаперспектыва", ТАА "Аракул", БВТ "Хата", Беларускі Фонд Сораса, ВПК "Жасскон". Напрыклад, кампанія "Тэхналогія" наогул спецыялізуецца на выпуску ў асноўным выданняў на беларускай мове. Рэпертуар кампаніі ўлучае кнігі рэлігійнага зместу ("Службоўнік", "Беларускі праваслаўны малітоўнік"), па філасофіі, гісторыі, культуры. У 1996 г. "Тэхналогія" выдала навучальны дапаможнік для студэнтаў па эканоміцы, першую частку якога складаюць "Уводзіны ў эканоміку" і "Мікраэканоміка", другую — "Макраэканоміка". Сярод прыватных трэба вылучыць выдавецтвы Ваніна, М. А. Расолькі.

Для высвятлення карціны выдання беларускамоўнай літаратуры па тэматычным і мэтавым прызначэнні намі паводле "Летапісу друку Беларусі" быў выяўлены рэальны паток выданняў за 1993—1995 гг. Трэба адзначыць, што адзінкі назваў складаюць кнігі на беларускай мове па філасофіі, псіхалогіі, прыродазнаўчых і прыкладных навуках, мастацтве, краязнаўстве і інш.

Значная колькасць (30,3%) кніг выдадзена па раздзеле "Народная адукацыя. Выхаванне". Гэта і метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў, зборнікі экзаменацыйных матэрыялаў, навучальныя дапаможнікі, хрэстаматыі па літаратуры народаў свету, падручнікі-хрэстаматыі па роднай літаратуры. Сярод кнігавыдаўцоў літаратуры па дадзенай тэматыцы трэба назваць НКФ "Экаперспектыва", Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр, ТАА "Аракул", фірму "Асар", ВПК "Жасскон".

Больш за 22,4% кніжнай прадукцыі складае мастацкая літаратура. Нельга не звярнуць увагу на тое, што асноўная частка мастацкай літаратуры недзяржаўнымі ўстановамі выдаецца на рускай мове як больш выгадная з камерцыйнага боку.

Станоўчым можна лічыць вопыт НДК "Маркетынг" па выданні ў 1994 г. у серыі "З сабой у дарогу" твораў шэрагу беларускіх аўтараў: Я. Коласа, Я. Маўра, І. Мележа, Я. Скрыгана, К. Чорнага, Я. Брыля, А. Васілевіч, М. Гарэцкага, Г. Далідовіча. Аднак у 1995 г. падобных прыкладаў не назіраецца. За гэты перыяд выдадзены толькі аповесці І. Шамякіна і перакладзены на беларускую мову творы Т. Шаўчэнкі. Асноўная частка ў 1995 г. мастацкай літаратуры ўлучае творы такіх аўтараў, як А. Пісарык, І. Карэнда, І. Басецкі, А. Усеня, А. Зэкаў, В.Івашын, М. Трафімчук, У. Бельскі, У. Ліпскі, В. Якавенка.

Невялікую колькасць, на жаль, складаюць творы на беларускай мове для дзяцей. Але ёсць выданні, якія сталі ўжо вядомымі. Так, кніга Н. А. Сторажавай і С. С. Аніскевіч "Адна сям'я — ад А да Я" толькі ў 1995 г. ВКІП "Асар" выдавалася двойчы.

Трэба адзначыць, што недзяржаўныя выдавецкія структуры рэспублікі ў адрозненне ад дзяржаўных не прытрымліваюцца строгай тэматыка-тапалагічнай накіраванасці. Аднак, на наш погляд, ім неабходна: па-першае, актывізаваць дзейнасць па выданні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратуры на роднай мове, што будзе спрыяць духоўнаму адраджэнню нашага грамадства; па-другое, засяродзіць увагу на выданні літаратуры даведкавага характару: энцыклапедый, слоўнікаў, а таксама літаратуры для дзяцей; па-трэцяе, аддаваць больш увагі перакладам на беларускую мову лепшых твораў сусветнай літатаруты.

## Даведкавыя выданні Беларусі: камплектаванне і выкарыстанне ў публічных бібліятэках

*Святлана ЗЫГМАНТОВІЧ, канд. пед. навук, дацэнт,*
*Валянціна САІТАВА, канд. пед. навук, дацэнт*
*кафедры дакументазнаўства і бібліяграфіі*
*Беларускага універсітэта культуры*

Змены, якія перажылі публічныя бібліятэкі ў 90-я гады, дапамаглі бібліятэкарам асэнасаваць важную з'яву: грамадскасць актыўна заахвочвае гэтыя бібліятэкі ўзмацняць інфармацыйную дзейнасць, удасканальваць сістэму інфармацыйнага сэрвісу.

Вытворчасць паслуг інфармацыйнага характару залежыць ад рэсурснай базы кожнай з бібліятэк, у тым ліку ў значнай ступені ад стану фонду даведкавых выданняў. Дадзеныя Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі паказваюць, што ў 90-я гады колькасць даведкавых выданняў штогод складала прыкладна 150 назваў, у 1993—1994 гг. іх было выпушчана значна больш — 176 і 194 назвы. Ад 1993 г. большую палову ад агульнай колькасці даведкавых выданняў друкуюць недзяржаўныя выдавецтвы і арганізацыі з выдавецкімі правамі. Так, у 1995 г. на іх долю прыпадала 65% даведкавых выданняў.

Сярод станоўчых рысаў дзейнасці недзяржаўных выдавецтваў на рынку даведкавых выданняў адзначым з'яўленне буйных вытворцаў даведкавай прадукцыі, сярод якіх ёсць айчынныя і сумесныя фірмы — даччыныя прадпрыемствы вядомых замежных вытворцаў даведкавай прадукцыі. Гэта шведскі канцэрн "Тэлемедыа" і яго даччынае СП "Белфакт", "НІЦП —КОМПАСС", "Мэджык", ААТ "Місанта" і інш.

У выніку іх дзейнасці з'явіліся салідныя штогоднікі з інфармацыяй пра Беларусь: тэлефонны каталог "Бизнес-Беларусь", "КОМПАСС Беларуси, 1995/96" і інш., створаныя паводле ўзораў даведкавай прадукцыі гэтых фірмаў. Арыгінальную і значную даведкавую літаратуру выпускаюць многія беларускія недзяржаўныя выдавецтвы.

Сама аператыўныя патокі даведкавай інфармацыі паступаюць праз СМІ, сярод якіх для бібліятэк найважнейшыя перыядычныя выданні. У гэтых выданнях ужываюцца зручныя формы вылучэння і структурызацыі даведкавых дадзеных. Склалася і пэўная тэматычная спецыялізацыя перыядычных выданняў у сферы інфармавання насельніцтва.

На рынку вытворчасці даведкавых выданняў дзяржаўныя і недзяржаўныя выдавецтвы і ўстановы вызначылі свае прыярытэты і інтарэсы, стварылі нямала карыснай даведкавай прадукцыі і маюць перспектыву для развіцця дзейнасці, разлічваючы на нязменны фактар — інфармацыйныя патрэбы карыстальнікаў.

У публічных бібліятэк, на жаль, вельмі малыя магчымасці і шанцы выкарыстаць паток даведкавых выданняў. Асноўная прычына — спыненне працэсу нармальнага папаўнення новымі выданнямі, якое назіраецца ўжо на працягу некалькіх гадоў.

Востры недахоп даведкавых выданняў змусіў бібліятэкараў выкарыстоўваць розныя спосабы, каб назапашваць дадзеныя, неабходныя для задавальнення разнастайных патрэб карыстальнікаў у неабходнай інфармацыі.